Источник: **«Рэспубліка» - 2013-06-07**

# Як сімвал і дзеля красы

***Марына БАРАДАЎКА, «Р»***



**Дабро на далейшую рэалізацыю атрымалі два аб’екты манументальнага мастацтва, прысвечаныя слуцкаму поясу**

У краіне працягваецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012—2015 гады.

Сур’ёзная рэканструкцыя ідзе ў вытворчым корпусе РУП мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы», што знаходзіцца на вуліцы М. Багдановіча ў Слуцку. У гэтым кантэксце значная ўвага нададзена і добраўпарадкаванню тэрыторыі, якая набудзе свой стыль і мастацкую завершанасць. Зусім хутка там з’явяцца два новыя манументальныя аб’екты. А непасрэдна ў корпусе будзе створаны ўнікальны музей слуцкіх паясоў.

Днямі адбылося чарговае пасяджэнне Мінскага абласнога мастацка-экспертнага савета па манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве, на якім разгледжаны мадэлі ў мяккім варыянце. Скульптура «Ткач», над якой працуюць скульптар Сяргей ГУМІЛЕЎСКІ **(на здымку)** і архітэктар Ірына Варанец, будзе сустракаць наведвальнікаў пры ўваходзе ў вытворчы корпус прадпрыемства. Яна ўяўляе сабой фігуру майстра часоў старадаўняй мануфактуры, які беражліва трымае ў руках слуцкі пояс і з замілаваннем глядзіць на тварэнне сваіх рук. «Ідэя з’явілася ў сувязі з тым, што вытворчы комплекс і музей — гэта месца, дзе, несумненна, будзе шмат наведвальнікаў, турыстаў. І трэба, каб яно мела свой сімвал, які б адразу прыцягваў позірк, заставаўся ў памяці, на фотаздымках і надалей асацыіраваўся з прадпрыемствам і яго адметнай прадукцыяй. Таму фігура мае адносна камернае, крыху жанравае рашэнне, што цалкам апраўдана», — адзначыў загадчык аддзела Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі кандыдат мастацтвазнаўства, навуковы кіраўнік праекта ў Слуцку Барыс Лазука.

Другая скульптура — «Адраджэнне слуцкага пояса» — зойме сваё месца ў скверы, у непасрэднай блізкасці да вытворчасці, дзе будуць вырабляцца копіі знакамітых паясоў, і да таго гістарычнага месца, дзе некалі стаялі мануфактуры. У скверы ўжо шмат што зроблена: пракладзены дарожкі, устаноўлены сцяцільні і нават пляцоўка для будучай манументальнай кампазіцыі. Твор прадстаўлены ў досыць дэкаратыўным вырашэнні, гэта скульптурны вобраз пояса. Работа зноў жа Сяргея Гумілеўскага і архітэктара Анатоля Казленкі. Стужкі слуцкага пояса абрамляюць кветку, якая расце і ва ўсёй сваёй прыгажосці распускае пялёсткі. У ніжняй частцы з двух бакоў змешчаны гербавыя кампазіцыі — гэта герб горада Слуцка і радзівілаўскі вензель. «Кветка, што вырастае ў такой паўсферы, — гэта тэма адраджэння слуцкага пояса, асноўная ідэя,

што ўвасобілася ў скульптурным вобразе. Герб Слуцка — патрэбны і зразумелы элемент. Вензель, выкананы ў геральдычным рашэнні, — даніна ўдзячнасці Радзівілам, якія арганізавалі такую адметную вытворчасць менавіта ў Слуцку», — расказвае скульптар Сяргей Гумілеўскі. Майстар падзяліўся, што працаваў над абодвума праектамі з асаблівым натхненнем, бо тэма для яго з’яўляецца надзвычай цікавай і блізкай. Папярэдне было вывучана шмат спецыяльнай літаратуры, якая дазволіла прытрымлівацца ў рабоце гістарычнай праўды, а гэта вельмі важна, бо слуцкія паясы — гэта не проста сімвал, гэта прадмет нацыянальнага гонару.

«Трэба сказаць, што ўсе мы адчуваем вялікую адказнасць за вынік. Зроблена велізарная работа ў даволі сціслыя тэрміны. Раўнадушных тут няма. Шчыра прызнаюся, я не мог абысціся без дапамогі і кансультацый слуцкіх краязнаўцаў, якія добра валодаюць матэрыялам па тэме. Слуцк актыўна прымаў удзел у абмеркаванні праектаў, эскізы былі прадстаўлены ў райвыканкаме, выказваліся прапановы, пажаданні. Аўтары пастараліся зрабіць так, каб манументальныя рэчы ўспрымаліся ўсімі. Я ўпэўнены, што скульптурныя кампазіцыі будуць не проста годным упрыгажэннем усяго комплексу, а важнейшай яго часткай», — падкрэсліў Барыс Лазука.

І вось зараз работа выходзіць, так бы мовіць, на фінішную прамую. Апошняе абмеркаванне абласнога мастацка-экспертнага савета па манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве адбылося ў майстэрні скульптурнага камбіната, дзе кампазіцыі былі прадстаўлены ў натуральную велічыню ў мяккім матэрыяле. Усе члены савета аднагалосна выказаліся «за». Ухваліў работу і заказчык, гэта меркаванне выказала намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама Ларыса Дабравольская. Вынікі падвёў старшыня савета, вядомы скульптар, народны мастак Беларусі Іван Міско: «У час таго, калі Сяргей Гумілеўскі працаваў, мы пільна назіралі, неаднаразова збіраліся, абмяркоўвалі дэталі. Я таксама задаволены творчай працай і лічу, што неабходна работу прыняць і даць дабро на наступныя этапы. Вельмі хочацца паглядзець творы ў матэрыяле».

Зусім хутка мадэлі пройдуць фармоўку і адліўку, і ўжо гэтым летам мы ўбачым дзве арыгінальныя бронзавыя скульптуры ў ансамблі ў Слуцку.

***На здымку:*** *у час работы Мінскага абласнога мастацка-экспертнага савета.*
*Фота: Юрый МАЗАЛЕЎСКІ*